**ВОДЗЫЎ**
**на аўтарэферат дысертацыі Сямашка Надзеі Канстанцінаўны**
**“Беларускія і расійскія даследаванні аграрнай гісторыі Беларусі (канец XVIII ст. – 1850-я гг.)”**, прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.09–гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання

Сельская гаспадарка з’яўляецца адной з найважнейшых галін сучаснай беларускай эканомікі, таму каласальнае значэнне мае навуковае вывучэнне яе гісторыі, тэндэнцый яе развіцця. У гэтай сувязі зварот саіскальніка да аграрнай гісторыі бачыцца абсалютна актуальным і мэтазгодным.

Аўтарэфэрат сведчыць, што дысертацыя характарызуецца прадуманасцю пабудовы і лагічнасцю. Саіскальнікам дакладна сфармуліраваны мэта і задачы даследавання, для вывучэння праблемы выкарыстаны шырокі набор метадаў, пераканаўча паказана канцэптуальная ідэя дысертацыі. Храналагічныя рамкі даследавання карэліруюцца с пачаткам вывучэння праблемы і сучасным станам яе распрацоўкі. Асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону, адэкватна адлюстроўваюць вынікі дысертацыйнага даследавання, вызначаюцца навізной і абгрунтаванасцю.

Саіскальнік здолеў прааналізаваць публікацыі даследчыкаў дарэвалюцыйнага перыяду, выявіць асноўныя напрамкі і прыярытэты даследаванняў савецкага часу, упершыню ў айчыннай гістарыяграфіі правесці аналіз сучаснага стану вывучэння аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII – 1850-х гадоў. Дысертантам адзначаецца, што для даследчыкаў дарэвалюцыйнага перыяду характэрны апісальны падыход пры мінімальным выкарыстанні гістарычных крыніц. Спецыфікай савецкай гістарыяграфіі з’яўляўся комплексны падыход пры панаванні марксісцка-ленінскай метадалогіі. Аналіз даследаванняў сучаснага перыяду, якія праводзіліся ва ўмовах дэідэалагізацыі гістарычнай навукі і выкарыстання новых метадалагічных падыходаў, дазволіў дысертанту вылучыць новыя тэндэнцыі ў вывучэнні аграрнай гісторыі – перабольшванне тэмпаў генезісу капіталізму ў беларускай вёсцы савецкімі гісторыкамі, акцэнт на вывучэнне розных саслоўных груп і інш.

Станоўчым момантам з’яўляецца той факт, што ў дысертацыі аналізуецца не толькі выключна айчынная і расійская гістарыяграфія, але і паказваецца фарміраванне і дынаміка базы крыніц па разглядаемай праблеме.

Вынікі навуковага пошуку дысертанта знайшлі адлюстраванне ў 16-ці публікацыях агульным аб’ёмам 4,4 друкаваных аркушаў, а таксама прайшлі апрабацыю на шэрагу навуковых канферэнцый. Дысертацыя мае відавочную практычную значнасць, яе вынікі могуць быць выкарыстаны ў навучальным працэсе, пры падрыхтоўцы агульных і спецыяльных курсаў па гісторыі Беларусі, а таксама пры напісанні абагульняючых прац па аграрнай гісторыі.

Аўтарэферат не утрымлівае прынцыповых недахопаў і цалкам адпавядае патрабаванням ВАК Рэспублікі Беларусь. Аналіз аўтарэферата дысертацыі сведчыць, што Сямашка Надзея Канстанцінаўна з’яўляецца сталым даследчыкам і заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.09–гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання.

Загадчык кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін УА “Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт”, кандыдат гістарычных навук, дацэнт — Я.А. Грэбень

РЕСПУБЛИКА БЕЛАРУСЬ г.МИНСК УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ АГРАРНЫЙ ТЕХНИЧЕСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ